# Зорка нарадзілася: вінаватая магія?

**Кажуць, каб дасягнуць мары, трэба думаць маштабна і верыць у свае шалёныя ідэі. Амбіцыйная, яркая і дзёрзкая! Такой з'яўляецца наша новая гераіня Паліна Суворава. У свае 22 гады выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — пастаянная ўдзельніца самых маштабных эстрадных праектаў нашай краіны. Памочніца рэжысёра, актрыса, вядучая — як гэта ўсё змяшчацца ў адным чалавеку?**



За кожнай таленавітай асобай стаіць яе сям'я. Бацькі Паліны ў выхаванні дачкі прытрымліваюцца зладжаных прынцыпаў: нічога не навязваць, уважліва слухаць і падтрымліваць. Дзякуючы такой атмасферы ў сям'і дзяўчына ні на секунду не сумнявалася ў сваім прафесійным выбары. Як вядома, у Новы год здараюцца цуды. Сустракаючы 2018-ы за святочным сталом, наша гераіня агучыла свой намер: паступлю ва Універсітэт культуры і мастацтваў, на іншае не пагаджуся. Усталёўкі абітурыенткі былі сур'ёзныя, бо яна не прывыкла даваць сабе права на памылку.

**— Як вы абралі сваю будучую прафесію?**

— На працягу 11 гадоў у школе я шмат часу праводзіла ў кабінеце педагога-арганізатара. Гэта былі не тыповыя прагулы школьніка, як мяркуюць некаторыя настаўнікі. Дзякуючы гэтым сустрэчам я выяўляла сваю творчую асобу. Калі прыйшоў час абіраць ВНУ, выразна ўсведамляла, што жыць і вучыцца толькі мне. Таму трэба зрабіць самастойны выбар і думаць, дзе можна ў поўнай меры раскрыць свой патэнцыял. БДУКМ — месца, дзе душы таленавітых людзей яднаюцца ў адзіным творчым парыве. Пагутарыўшы з выпускнікамі, пачытаўшы шмат водгукаў і рэкамендацый, прыслухаўшыся да свайго сэрца, я зразумела: факультэт мастацкай культуры — маё!

## ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

З дзяцінства Паліна прывыкла настойліва працаваць над сваімі жаданнямі. "Галоўнае верыць у свае сілы, а калі да гэтага прыкласці пэўныя намаганні, даможашся 100% поспеху!" — запэўнівае дзяўчына. Яшчэ да паступлення будучая студэнтка пазнаёмілася з універсітэтам, наведваючы падрыхтоўчыя курсы.

**— У студэнцкія гады поруч з намі з'яўляюцца настаўнікі, якія дапамагаюць вызначыцца з жыццёвымі арыенцірамі. Хто для вас стаў такой асобай?**

— У маім універсітэце працуюць выкладчыкі з неверагодным унутраным светам, яны гатовы падарыць кожнаму студэнту свае веды і падзяліцца досведам. Але ёсць адзін асаблівы чалавек, які ўразіў мяне сваім прафесіяналізмам. Ён стаяў ля вытокаў стварэння такіх буйных фестываляў, як "Славянскі базар у Віцебску", "Дажынкі", "Памяць", "Песні свету" ў Малдове і шмат іншых. І выхаваў дзясяткі таленавітых вучняў, якія цяпер працуюць у розных кутках свету. Гэты Настаўнік — чалавек-слова, чалавек- талент, легенда нашага часу! Я з вялікім гонарам і падзякай кажу, што станаўленне маёй асобы прайшло пад чуйным кіраўніцтвам Аляксандра Дзмітрыевіча Вавілава, дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэты чалавек выхаваў маю ўнутраную волю, даў магчымасць выявіць сябе і дазволіў набірацца досведу ў мэтра.

Навучанне ў цэлым абточвала мяне як асобу: пачынаючы з уступных экзаменаў і развіваючы мяне не толькі ў спецыяльнасці. Са школьных часоў я была старастай і брала на сябе адказнасць за ўсе важныя пытанні. Гэту ж традыцыю працягнула ва ўніверсітэце, там мае лідарскія якасці толькі памацнелі.

## СПЯВАЦЬ "ЗЯЛЁНЫ ВІНАГРАД" З АЛЯКСАНДРАМ САЛАДУХАМ

Выпускнікі творчых ВНУ ў адзін голас раяць будучым студэнтам надаваць час не толькі навучанню, але і самаразвіццю. Максімальна выяўляць сябе ў розных праектах, браць удзел ва ўніверсітэцкіх імпрэзах і канцэртах — усё гэта створыць неацэнны багаж ведаў і карысных знаёмстваў.

**— Маглі б вы расказаць пра самыя яркія эпізоды вашага студэнцкага жыцця?**

— Ніколі не забудуся пра вопыт удзелу ў фестывалі "Славянскі базар у Віцебску". На працягу навучання Аляксандр Дзмітрыевіч браў мяне памочніцай рэжысёра і імкнуўся расказаць пра ўсе сакрэты і традыцыі гэтага фэсту. Я атрымлівала практычныя веды, гэта здаецца мне неацэнным.

Усе нймаверныя сустрэчы адбываюцца менавіта на маштабных імпрэзах. Ведаеце, я стала тым чалавекам, які бачыў зорак праз экран тэлевізара, а потым апынуўся поруч з імі за сцэнай. І на тваю сумачку выпадкова сядзе Вольга Бузава, ты дасі "пяць" Валерыю Лявонцьеву і праспяваеш з Аляксандрам Саладухам яго легендарны "Зялёны вінаград" пад гасцініцай у 4 раніцы. І гэта толькі маленькія драбніцы вялікай эстраднай прыгоды!

За чатыры гады, дзякуючы Аляксандру Дзмітрыевічу, я набыла каласальны досвед. Пад яго кіраўніцтвам стала часткай буйных конкурсаў, а таксама прыклала не мала ўласных сіл у арганізацыю імпрэз. Нават паспела прымерыць на сябе ролю вядучай, што было для мяне зусім нова.

## МАГІЯ ЎНУТРЫ НАС

Звычайна яркаму пачатку ўласцівы не менш бліскучы фінал. На апошняй мяжы Паліна павінна была вызначыцца з тэмай дыпломнай работы. Супадзенні не выпадковыя. Паважаны выкладчык студэнткі Аляксандр Вавілаў вырашыў рэалізаваць сваю маштабную задумку: паставіць мюзікл "Магія". Для такога велізарнага праекта спатрэблася надзейная каманда. Такім чынам наша гераіня стала актрысай мюзікла "Магія", які і быў тэмай яе дыпломнай работы.

**— Раскажыце, як праходзіла падрыхтоўка да прэм'еры?**

— Ад стварэння ідэі да яе рэалізацыі прайшло два гады. Спачатку прапісваўся сцэнарый, стваралася музыка, змяняліся дыялогі, збіраліся тэхнічныя групы. З артыстамі праца доўжылася год: маўленне, балет, пластычныя вырашэнні, рэпетыцыі эпізодаў, поўныя прагоны — усё адточвалася да дэталяў. Мы літаральна начавалі ў рэпетыцыйнай зале. Да гэтага мы бачылі падобнае толькі ў фільмах, дзе ствараецца буйныя праекты і трупа ночы напралёт рэпеціруе.

Я была не толькі памочніцай рэжысёра, але яшчэ і артысткай. Мела ролю вясковай дзяўчыны, якая прыехала заваёўваць сталіцу. У прынцыпе гэтак і ёсць у жыцці. Сама я з горада Жлобіна. Мне было вельмі проста пранікнуцца гэтай роллю, бо я грала саму сябе.

Для мяне стварэнне мюзікла на падмостках новага Спартыўна-культурнага комплексу БДУКМ стала дзецішчам, нечым родным і вельмі дарагім сэрцу. Мне не хацелася ісці з рэпетыцый, а хацелася ўкласці ў гэту справу як мага больш. Мае заданні былі абсалютна рознабаковымі: ад стварэння партрэтнай здымкі артыстаў да арганізацыі цёплых сустрэч трупы мюзікла.

## МАСКІ ДЛЯ АРТЫСТА — ГЭТА КРЫЖ

Чаканая прэм'ера мюзікла адбылася 18 мая 2022 года ў Мінску. Да гэтага "Магія" пераносілася ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй. "Санітарныя маскі для артыста — гэта крыж. Калі не бачны эмоцыі, а толькі вочы, ствараецца іншае ўражанне", — прызнаецца Паліна Суворава.

Пастаноўку А.Д. Вавілава можна лічыць унікальнай. У мюзікле дзеля адной мэты з'ядналіся выкладчыкі, беларускія і кітайскія студэнты. Атрымаць асалоду ад творчасці таленавітай трупы змаглі і жыхары Бабруйска на Фестывалі народнай творчасці. У асобны дзень мюзікл прэзентаваў сябе на "Бабруйск-арэне" са сцэнічным аглядам у 360 градусаў.

**— Вас можна павіншаваць з дзвюма прэм'ерамі. Як бы вы апісалі свой выступ у Мінску і ў Бабруйску?**

— Ты выходзіш на сцэну і не выконваеш ролю, а жывеш. Сціраюцца межы паміж сэрцам гледача і табой.

У Бабруйску амаль не было часу на рэпетыцыі, бо мы некалькі дзён працавалі памочнікамі рэжысёра на фэсце. Менавіта па прыездзе мы зразумелі, што цяпер убачым, чаму навучыліся. Тэхнічна і фізічна гэта было складана, бо ты спяваеш, граеш, узаемадзейнічаеш з гледачом. Тым часам ты стаіш на сцэне з аглядам у 360 градусаў і ў дадатак да гэтага цябе здымаюць камеры, якія транслююць дзеянне на экраны. Было ўсё: кветкі, слёзы, авацыі.

Прэм'ера ў Мінску прайшла з ашаламляльным поспехам. Калі кулісы былі яшчэ закрыты і прагучалі словы нашага канферансье, усярэдзіне завіравала кроў. Узнімаецца заслона, светлавыя гарматы асляпляюць табе вочы, мурашкі пакрываюць тваё цела, і ты разумееш: няма права на памылку. У зале сядзяць бацькі, якія ўбачаць вынікі тваёй доўгай працы. Менавіта тады, калі глядач сустракаецца паглядам з акцёрамі, прыходзіць усведамленне, што пра такі фінал можна марыць.

Дзіўна было знаходзіцца на адной сцэне з Аляксандрам Дзмітрыевічам, які прыняў цябе, як маленькую, на першым курсе. Развіў акцёрскія задаткі, пластыку, драматургію, сфарміраваў паняцце пра сцэну і пра тэатр. І вось вы робіцеся калегамі па цэху і ствараеце нешта неверагоднае.

Наша гераіня размеркавалася ў родны ўніверсітэт у якасці культурнага арганізатара. І ўжо сёння ў таленавітай дзяўчыны ў распрацоўцы некалькі творчых праектаў, якія ў хуткім часе яна прэзентуе шырокай публіцы. Упэўненыя, імя Паліны Суворавай прагучыць на вялікай сцэне яшчэ не раз.

Настасся ЮРКЕВІЧ

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ